УДК 947.2:323.311

**А. А. Дамарад**
Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт

# САЦЫЯЛЬНА-ПРАВАВЫ СТАТУС НОСЬБІТАЎ ДВАРАНСКІХ ТЫТУЛАЎ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У КАНЦЫ XVIII – СЯРЭДЗІНЕ XIX СТ.

Дваранскія тытулы ў эпоху феадалізму былі важнай сацыяльнай прыкметай, якая вылучала іх з агульнай масы феадалаў. У эпоху панавання еўрапейскіх імперый тытулы працягвалі выконваць важную ролю ў стратыфікаваным грамадстве XVIII–XIX стст. Насельніцтва тэрыторый Рэчы Паспалітай, апынуўшыся пад суверэнітэтам Аўстрыі, Прусіі і Расіі, па-рознаму інтэгравалася ў новую сацыяльную структуру. Тытулы па-ранейшаму працягвалі выконваць для дваран надзвычай важную ролю ў іх адносінах з дзяржаўнай адміністрацыяй, у тым ліку пры прававым замацаванні сацыяльных, эканамічных і палітычных правоў. У гэтым кантэксце ў артыкуле аналізуюцца асаблівасці выкарыстання дваранскіх тытулаў, атрыманых у Рэчы Паспалітай.

**Ключавыя словы:** тытул, дваранства, сацыяльны статус, князь, граф, барон.

**A. A. Damarad**
Belarusian State Technological University

# NOBLE TITLES CARRIERS OF THE RECH POSPOLITAYA SOCIAL AND LEGAL STATUS IN THE LATE XVIII – MIDDLE OF XIX CENTURY

Titles of nobility in the feudal era was an important social feature that distinguishes them from the total mass of the feudal lords. In the era of the rule of European empires titles continued to play an important role in a stratified society XVIII–XIX centuries. The population of the territories of the Rech Pospolitaya, being under the sovereignty of Austria, Prussia and Russia differently integrated into the new social structure. Titles still continued to perform for nobles extremely important role in their relations with the public administration, including the legal consolidation of social, economic and political rights. In this context, the article analyzes the characteristics of the use of titles of nobility, obtained in the Rech Pospolitaya.

**Key words**: title of nobility, social status, Prince, Count, Baron.

**Уводзіны.** Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі, Аўстрыі і Прусіі стварылі праблему сацыяльнай адаптацыі насельніцтва да новых умоў жыцця. Закранула гэтая праблема і вышэйшае саслоўе. Зразумела, што тытулаваныя роды і асобы былой Рэчы Паспалітай не жадалі губляць свае прывілеі і нават шукалі магчымасці да іх пашырэння.

Усяго ў Гродзенскай, Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губернях налічвалася 65 тытулаваных шляхецкіх родаў. У параўнанні з агульнай колькасцю шляхты на адзначаных тэрыторыях – 6845 родаў – гэта толькі 0,95%. Падобныя лічбы атрымліваюцца таксама і па асобных губернях. У прыватнасці, у Магілёўскай губерні тытул баронаў насілі два роды (Брэмзены, фон Нолькены), графаў – чатыры (Грабоўскія, Талстыя, Сумарокавы, Цукатто), князёў – восем (Крапоткіны, Дандуковы-Корсакавы, 2 галіны Любамірскіх, Мяшчэрскія, Абаленскія, Паскевічы-Эрыванскія, Друцкія-Сакалінскія) [1, с. 13]. Іх колькасць складала каля 1% ад агульнай колькасці шляхецкіх родаў (1371). Аднак матэрыяльныя рэсурсы, якімі валодалі тытулаваныя фаміліі, як правіла, не ішлі ў ніякае параўнанне з магчымасцямі звычайных дваран. Для апошніх гэта былі сапраўдныя сацыяльна-саслоўныя лідары.

**Асноўная частка.** Паходжанне тытулаў шляхты беларускіх зямель патрабуе асобнага разгляду. Найперш, сярод шляхты беларускіх зямель, як у цэлым у Рэчы Паспалітай, здаўна адбывалася паступовая дэвальвацыя княжацкага тытула. Замест яго асаблівую значнасць набывае абазначэнне «пан» (магнат). Патлумачыць гэта можна тым, што, акрамя заможнасці, паны-магнаты займалі пасады, якія разглядаліся шляхтай як вышэйшыя за тытулы (асабліва калі апошнія не заўсёды сумленна атрымліваліся недзе за мяжой) [2, с. 134].

У беларускіх землях урэшце рэшт замацаваліся толькі тры дваранскія тытулы: князь, граф, барон. З пачатку існавання Вялікага княства Літоўскага адзіным тытулам быў тытул князя. На гэты конт Ф. Булгарын пісаў: «Только одни князья Рюрикова и Гедеминова рода сохраняли княжеское звание, и таких родов было весьма немного» [3, с. 165]. Але А. П. Грыцкевічам спецыяльна была звернута ўвага на тое, што ў лацінскім тэксце знакамітага Гарадзельскага прывілея 1413 г. у дачыненні да Вялікага

Княства Літоўскага згадваюцца barones – бароны – у якасці раўназначнага беларускаму «паны», што значыць «старэйшыя» – знатныя – баяры. Гэта былі нашчадкі літоўскіх і заходнерускіх «старэйшых» баяр, якія атрымалі буйныя зямельныя ўладанні ад самога вялікага князя [4, с. 65–67]. Як і прыбалтыйскія бароны-«фрайгеры» (ад ням. Freiherr – даслоўна – «свабодны спадар») у Лівонскім ордэне, іх суседзі і калегі ў Вялікім Княстве Літоўскім гэтак жа валодалі сваімі маёнткамі «с полным правом и панством». Практычная тоеснасць беларуска-літоўскіх паноў і нямецкіх фрайгераў увасаблялася ў выкарыстанні ў дачыненні як для тых, так і другіх аднолькавага лацінамоўнага тытула «barones». Але, у адрозненне ад Прыбалтыкі, у Беларусі ён не замацаваўся.

Тытул князёў насілі нашчадкі Рурыкавічаў князі Чацвярцінскія і Масальскія, нашчадкі Гедымінавічаў князі Сангушкі і Чартарыйскія, а таксама некаторыя іншыя роды, напрыклад, Глінскія [5, с. 5]. На працягу XV ст. – 1795 г. толькі тры разы княжацкі тытул надаваўся Соймам: у 1764 г. – Панятоўскім, у 1768 г. – Сапегам і ў 1773 г. – Панінскім. Атрыманне іншымі шляхецкімі сем'ямі гэтага тытула было звязана, перш за ўсё, з наданнем яго імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі. Такім шляхам тытул князя атрымалі Радзівілы (1547 г.), Асалінскія (1634 г.), Любамірскія (1647 г.), Сапегі (1700 г.), Ябланоўскія (1743 г.) і Сулкоўскія (1752 г.). Астатнія наданні княжацкай годнасці, асабліва пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, праводзіліся і іншымі замежнымі манархамі, напрыклад імператарам Напалеонам I.

Тытулы графаў і баронаў таксама атрымліваліся, у асноўным, за мяжой. У Рэчы Паспалітай толькі сем шляхецкіх родаў былі надзелены тытулам графаў або баронаў раней як у 1772 г. [2, с. 14]. З другога боку, Ф. Булгарын упэўнены, што графскага тытула ў Рэчы Паспалітай ніколі не існавала [3, с. 165]. Адзіным прыкладам узвядзення беларускага па паходжанні магнацкага роду ў графскую годнасць з'яўляецца наданне тытула ў 1568 г. Жыгімонтам II Аўгустам роду Хадкевічаў, праўда, ужо пасля атрымання імі гэтага тытула ад імператара Фердынанда ў 1555 г. Увогуле, ва ўсёй Рэчы Паспалітай адрозны ад адзначаных тытул меў толькі адзін шляхецкі дом – маркграфамі Свяшчэннай Рымскай імперыі былі Мышкоўскія. З пачаткам падзелаў Рэчы Паспалітай новыя ўлады імкнуліся прыцягнуць на свой бок як мага больш уплывовых родаў таксама і пацверджаннем іх тытулаў. У Аўстрыйскай імперыі дваранства ўвогуле дзялілася на тытулаванае і звычайнае рыцарства (die Ritterschaft). Далучыцца да першай групы ўладальнікам тытулаў з былой Рэчы Паспалітай было прасцей, чым яе шараговым шляхціцам трапіць у тое аўстрыйскае «рыцарства». Напрыклад, у 1782 г. аўстрыйскія ўлады вырашылі, што асобы, якія імкнуліся легалізаваць сваё шляхецтва, абавязкова павінны былі, акрамя дакументальных доказаў высакароднага паходжання, прадставіць таксама яшчэ каляровую выяву герба і ягонае блазаніраванне (геральдычнае апісанне). У сваю чаргу ў Прусіі працэс праверкі тытулаў і шляхецкіх правоў пачаўся з 1777 г. Патрабаванні па пацверджанні тытулаў тут былі практычна аднолькавымі з аўстрыйскімі, але ў Прусіі дадаткова неабходна было валодаць маёнткам.

Неабходна адзначыць, што дастаткова вялікая колькасць суіскальнікаў прызнання тытула спачатку пацвярджала яго менавіта па-за межамі Расіі. Вядомыя роды князёў Друцкіх-Любецкіх і князёў Палінскіх пацвердзілі свае тытулы ў 1798 г. у Аўстрыйскай імперыі і ў 1818 г. у Каралеўстве Прускім адпаведна [6, с. 2–3]. Пазней яны пацведзілі свае тытулы і ў Расійскай імперыі. Ужо ў 1809 г. Мінскі дваранскі дэпутацкі сход прыняў рэзалюцыю, паводле якой усе прадстаўнікі роду Друцкіх-Любецкіх прызнаны ў дваранскім і княжацкім статусе. Праўда, канчатковае прызнанне гэтага княжацкага тытула адбылося пасля загаду імператара Мікалая I толькі ў 1830 г. [7, л. 202].

Адам Казімір Чартарыйскі насіў тытул князя Свяшчэннай Рымскай імперыі, атрыманы ім ад імператара Іосіфа II у 1786 г. для сябе і нашчадкаў. Для старэйшага ў родзе дадаткова прадугледжвалася годнасць герцага каралеўства Галіцыі і Ладамерыі. Аднак, калі пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай большасць маёнткаў А. К. Чартарыйскага апынуліся ў Аўстрыйскай імперыі, ён прысягнуў менавіта дзяржаве Габсбургаў, а не Раманавых [8, с. 35]. Іншыя прадстаўнікі роду Чартарыйскіх, браты Адам Ежы і Канстанцін Адам, вымушаны былі паехаць у 1795 г. у Пецярбург, каб захаваць уладанні, што належалі ім у Расійскай імперыі. Там яны дзякуючы сваёй адукацыі сталі ад'ютантамі вялікіх князёў Аляксандра і Канстанціна адпаведна. Канстанцін Адам, тым не менш, з часу аўстра-французскай вайны 1809 г. змагаўся на баку Напалеона як генерал герцагства Варшаўскага. Падчас вайны 1812 г. ён таксама быў у напалеонаўскім войску і нават вызначыўся ў Смаленскай бітве [5, с. 67].

Як і ў Прусіі, аўстрыйскія ўлады падпарадкавалі на захопленых землях царкву дзяржаве. Імператрыца Марыя-Тэрэзія, каб прыцягнуць на свой бок шляхту «каралеўства Галіцыі і Ладамерыі» (г. зн. Галіцыі і заходняй Валыні), практычна ўсім родам, сярод продкаў якіх былі

«старасты», надавала графскі тытул. Тым самым быў створаны вялікі па колькасці пласт «аўстра-польскіх графаў», як іх назвалі ў гістарыяграфіі XIX ст. Справа ў тым, што нямецкае слова «Graf» было эквівалентным польскаму «starosta» і азначала пасаду «ўрадніка» – кіраўніка пэўнай вобласці ў складзе Рэчы Паспалітай. Землям, якімі валодаў ураднік (намеснік манарха), надавалася назва «hrabstwa». Падкрэслім: гэта быў не тытул, як у той жа Аўстрыі, а толькі пасада па прадстаўніцтве юрысдыкцыі манарха князя. Аднак пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, аўстрыйскія ўлады, ліквідаваўшы юрысдыкцыю «стараст», пакінулі за гэтымі асобамі графскі тытул як абазначэнне годнасці шляхецкага дому. Частка гэтакіх графаў на працягу XIX ст. пацвердзіла свае тытулы і ў Расійскай імперыі. Сярод такіх неабходна згадаць Александровічаў, якія атрымалі графскі тытул ад імператара Франца II у 1800 г. У Каралеўстве Польскім тытул быў прызнаны ў 1819 і 1838 гг., а ў Расійскай імперыі – у 1847 г. Акрамя таго, хадайнічаць аб графскім тытуле маглі былыя ваяводы і кашталяны, а аб баронскім – павятовыя чыноўнікі. Княжацкі ж тытул быў пацверджаны ўсімі яго носьбітамі без выключэння. Тытулаваная шляхта, а таксама вышэйшае духавенства склалі саслоўе магнатаў. Шляхта, якая не мела тытулаў, ператварылася ў рыцарскі стан. Уся яна вызвалялася ад ваеннай службы і захавала асобныя суды па цывільных і крымінальных справах. Да 1811 г. уладальнікі старастваў захоўвалі іх у сваёй маёмасці за спецыяльны падатак – дымідыю, – які складаў палову прыбытку.

Аўстрыйскія ўлады захавалі бачнасць саслоўнага прадстаўніцтва для шляхты. Марыя-Тэрэзія абвясціла аб стварэнні ў 1775 г. для каралеўства Галіцыі і Ладамерыі пастулатнага сойма. У яго склад уваходзілі асабіста ўсе магнаты і тыя прадстаўнікі рыцарскага стану, якія плацілі не менш за 300 злотых падаткаў у год, а таксама два дэпутаты ад горада Львова. Гэты сойм павінен быў збірацца штогадова. Пад юрысдыкцыю сходу падпадала толькі выпрацоўка шляхоў рэалізацыі імператарскіх законаў. Права заканадаўчай ініцыятывы пастулатны сойм не меў, за выключэннем магчымасці «пакорных прадстаўленняў» – г. зн. просьбаў да манарха. Аднак на практыцы землі былой Рэчы Паспалітай, далучаныя да Аўстрыйскай імперыі, жылі без саслоўнага прадстаўніцтва і кіраваліся выключна бюракратыяй. Прычым аўстрыйскі ўрад пайшоў па прускім шляху германізацыі краю, назначаючы сюды нямецкіх чыноўнікаў і заахвочваючы да перасялення нямецкіх пратэстантаў. Талерантны патэнт 1781 г. якраз быў накіраваны на рэалізацыю гэтых памкненняў. Каланістам раздаваліся былыя дзяржаўныя і езуіцкія маёнткі, на некалькі год яны вызваляліся ад падаткаў і ваеннага абавязку.

Прускія ўлады з 1796 г. усклалі на землеўласнікаў адказнасць за дзеянні сваіх прыгонных, а таксама абавязалі першых да 1 снежня 1796 г. вярнуцца ў свае маёнткі з-за мяжы. Выключэнне было зроблена толькі для тых, хто валодаў зямлёй таксама на тэрыторыі Расійскай ці Аўстрыйскай імперыі. У цэлым, першыя ж гады панавання дынастыі Гогенцолернаў на польскіх землях паказалі, што выезд землеўласнікаў за мяжу Прусіі стаў вельмі абмежаваны. З другога боку, «Патэнтам адносна падтрымання спакою і парадку ў новаздабытых правінцыях» устанаўліваўся тэрмін працягласцю шэсць тыдняў, у межах якога кожны беззямельны шляхціц павінен быў з’явіцца да ўладаў і паведаміць, ці жадае ён застацца ў краі або выехаць за мяжу. Для гэтай катэгорыі шляхты прускія ўлады не чынілі ніякіх перашкод, а наадварот, заахвочвалі яе эміграцыю, паколькі лічылі яе схільным да рэвалюцыі элементам. Вяртанне ў прускія уладанні для беззямельнай шляхты было амаль немагчымым. У цэлым «Патэнтам» улады стварылі атмасферу ўсеагульнай падазронасці, паколькі заахвочвалі даносы на ўдзельнікаў польскага нацыянальнага руху, у тым ліку сялян на сваіх паноў.

Увядзенне ў 1797 г. у польскіх правінцыях сістэмы прускага заканадаўства канчаткова абмежавала ўдзел шляхты ў кіраванні і грамадскім жыцці. Заканадаўства Рэчы Паспалітай было пакінута толькі ў спадчынным праве, а доступ шляхты да дзяржаўных пасад прадугледжваўся толькі ў якасці дарадцаў у судах па пытаннях, звязаных са старым заканадаўствам. Радзівілы, якія прынялі прускае падданства, пацвердзілі княжацкую годнасць толькі ў 1859 і 1861 гг. з тытулам «Светласць». Звязана гэта з тым, што, нягледзячы на шлюбны саюз з прускім каралеўскім домам, апошні расчараваўся ў Радзівілах і адвярнуўся ад іх. Нават у Расійскай імперыі княжацкі тытул Радзівілы пацвердзілі раней – у 1845 г. Трэба заўважыць, што гэтакі парадак атрымання дыпломаў зусім не тыповы, паколькі большасць арыстакратычных родаў былой Рэчы Паспалітай, у выпадку пацвярджэння імі сваіх тытулаў па-за межамі Расійскай імперыі, рабілі гэта раней.

У Прусіі шляхта захавала права землеўладання, але з некаторымі абмежаваннямі. Так, беззямельная шляхта магла набываць зямлю толькі пасля спецыяльнага каралеўскага дазволу. Такі ж дазвол патрабаваўся, каб атрымаць зямлю ў спадчыну, дар ці перадаць яе царкве. Акты куплі-продажу зямлі не мелі

юрыдычнай сілы без зацвярджэння мясцовага адміністрацыйнага органа – рэгенцыі.

На беларускіх землях у часы існавання Вялікага Княства Літоўскага жылі дваранскія роды, якія насілі тытул князя, але не былі нашчадкамі Рурыкавічаў ці Гедымінавічаў [9, с. 10]. Да такіх родаў належалі князі Гальшанскія, Гедройцы, Глінскія, Заблоцкія, Свірскія, Скірмунты і інш. Аднак з гэтага пераліку толькі князі Гедройцы змаглі пацвердзіць у Расійскай імперыі сваю княжацкую годнасць. На карысць адметнага становішча князёў Гедройцаў кажа той факт, што ў перапісе войска Вялікага Княства Літоўскага яны ўнесены ў спіс не разам з астатнімі князямі, а асобным «Рэестрам князей і баяр Гедройцкіх». На думку А. М. Нарбута, гэты факт звязаны з тым, што Гедройцы не займалі значных дзяржаўных пасад (акрамя біскупскіх і ваяводы мсціслаўскага), таму не былі аднесены да магнатаў [10, с. 49]. З другога боку, вядомы польскі спецыяліст па генеалогіі Е. Дунін-Баркоўскі паведамляе, што сярод фаміліі Гедройцаў у 1576–1796 гг. былі 33 сенатары [6, с. 20]. У Расійскай імперыі Рамуальд Уладзіслаў Гедройц, камергер імператарскага двара, пацвердзіў свой тытул у 1865 г. На гэта ў «Агульным гербоўніку дваранскіх родаў Расійскай імперыі» запісана, што Гедройцы «по присоединении Литвы к Российской державе служили Российскому Престолу в военной и гражданской службе и награждены были чинами, орденами и другими монаршими милостями…» [11, с. 3]. Князь Адольф Гедройц, уладальнік маёнка ў Віленскай губерні, пацвердзіў свой тытул у 1875 г. [12, с. 22]. Ягоны сын Цэзарый стаў дваранскім маршалкам Трокскага павета Віленскай губерні. Аднак з гэтага роду найбольш праслявіўся Рамуальд Тадэвуш, удзельнік паўстання 1794 г., член Ваеннага камітэта Варшаўскага герцагства і нават яго старшыня. Пасля таго, як ён быў захоплены ў палон і адбыў высылку ў Архангельску, стаў генералам у Царстве Польскім.

Іншыя Гедройцы ўпамінаюцца і ў радаводных кнігах Мінскай і Магілёўскай губерняў. Аднак унесены яны былі не ў пятую, а ў шостую яе частку, паколькі княжацкім тытулам яны не валодалі. Яшчэ ў 1834 г. у Вілейскі уездны суд быў прадстаўлены дакумент, у якім пацвярджалася права ўласнасці Багуслава Гедройца на зямлю з прыгоннымі ў вёсцы Задворцы [13, л. 18]. Ён жа праз два гады падаў на імя імператара прашэнне аб зацверджанні яго шляхецтва, на што Сенатам быў выдадзены указ ад 16 чэрвеня 1844 г. Цікава, што сын Багуслава Гедройца, Восіп, нават і без княжацкага тытула добра інтэграваўся ў расійскае прадпрымальніцтва, выехаўшы ў Якуцкую вобласць на золатаздабыўныя прадпрыемствы, дзе дабіўся вялікага багацця [13, л. 102].

**Заключэнне.** Такім чынам, працэсы, якія ахапілі тытулаванае дваранства беларускіх зямель, мелі складаны характар. Відавочна, што носьбіты дваранскіх тытулаў так ці інакш імкнуліся інтэгравацца ў дваранства для таго, каб карыстацца прывілеямі ў адпаведнасці з законам, пачынаючы ад права мець уласны герб і завяршаючы правам не плаціць падаткі. У кожным канкрэтным выпадку галоўны матыў такога імкнення быў свой, аднак, назіраючы за гэтым працэсам, можна сцвярджаць, што ўступаць свае шляхецкія правы і тытулы ніхто не збіраўся. Інтэграцыя тытулаванай шляхты былой Рэчы Паспалітай у склад дваранства Аўстрыі, Прусіі і Расіі праходзіла паспяхова. Дзяржаўныя адміністрацыі выкарыстоўвалі мясцовае тытулаванае дваранства ў якасці сваёй апоры ў справе захавання імперскіх парадкаў на сваёй тэрыторыі. Тая частка тытулаванага дваранства, што звязала сябе з новымі дзяржавамі цывільнай ці вайсковай службай, шлюбамі з прадстаўнікамі мясцовых дваранскіх родаў, без асаблівых цяжкасцяў пацвярджала тытулы і захоўвала свой сацыяльна-прававы статус. Прадстаўнікі арыстакратыі, якія інтэграваліся ў вышэйшае саслоўе Расіі, Аўстрыі і Прусіі, не толькі былі ўключаны ў склад дваранства, але і прынеслі новыя з’явы ў саслоўе – падштурхнулі ўлады да працы па стварэнні стройнай і ўпарадкаванай геральдычнай сістэмы, якая значна пашырылася менавіта дзякуючы шляхце былой Рэчы Паспалітай.

## Літаратура

1. Алфавитный список дворянских родов, внесенных в родословные дворянские книги Могилевской губернии. Могилев: Типо-Лит. Я. Н. Подзенского, 1909. 23 с.
2. Konarski S. O heraldyce i heraldycznym snobizmie. Warszawa: Adiutor, 1992. 315 s.
3. Булгарын Ф. Выбранае. Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. 592 с.
4. Грицкевич А. П. Формирование феодального сословия в Великом княжестве Литовском и его правовые основы (XV–XVI вв.) // Первый литовский статут 1529 года: материалы республиканской научной конференции, посвященной 450-летию Первого Статута. Вильнюс, 1982. С. 65–73.
5. Дворянские роды Российской империи. В 10 т. Т. 2 / авт.-сост. П. Гребеньский [и др.]. СПб.: ИПК «Вести», 1993. 262 с.
6. Dunin-Borkowski J. Almanach blekitny. Genealogie zyjacych rodow polskich. Lwow, 1908. 767 s.

7. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 319. Воп. 2. Спр. 1890. «Дело о происхождении рода князей Друцких-Любецких».
8. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca cztaternastego wieku. Warszawa, 1895. 473 s.
9. Долгорукий П. В. Российская родословная книга: в 4 ч. СПб., 1854. Ч. 1. 342 с.
10. Нарбут А. Н. Генеалогия Белоруссии. Вып. 2 (16–18 вв.). – М.: Изд-во «Анна», 1994. 168 с.
11. Общий гербовник дворянских родов Всероссийской империи, начатый в 1797 году. Часть тринадцатая. СПб., 1885. 562 с.
12. Boniecki A. Herbarz Polski. 16 t. T. 13. Warszawa, 1909. 400 s.
13. НГАБ. Ф. 319. Воп. 2. Спр. 689. «Дело о дворянском происхождении рода Гедройцей».

## References

1. *Alfavitnyy spisok dvoryanskikh rodov, vnesennykh v rodoslovnyye dvoryanskiye knigi Mogilevskoy gubernii* [An alphabetical list of noble families included in the family history books of the Mogilev province]. Mogilev, Tipo-Lit. Ya. N. Podzenskogo Publ., 1909. 23 p.
2. Konarski S. O heraldyce i heraldycznym snobizmie. Warszawa, Adiutor, 1992. 315 s.
3. Bulgaryn F. *Vybranaye* [Favorites]. Minsk, Belaruski knigazbor Publ., 2003. 592 p.
4. Gritskevich A. P. [Formation of the feudal estate in the Grand Duchy of Lithuania and its legal basis (XV–XVI centuries). The first Lithuanian statute of 1529]. *Materialy respublikanskoy nauchnoy konferentsii, posvyashchennoy 450-letiyu Pervogo Statuta* [Materials of the republican scientific conference dedicated to the 450th anniversary of the First Statute]. Vilnius, 1982, pp. 65–73 (In Russian).
5. *Dvoryanskiye rody Rossiyskoy imperii. V 10 t. T. 2* [Noble clans of the Russian Empire. In 10 vol. Vol. 2]. St. Petersburg, IPK "Vesti" Publ., 1993. 262 p.
6. Dunin-Borkowski J. Almanach blekitny. Genealogie zyjacych rodow polskich. Lwow, 1908. 767 s.
7. National Historical Archives of Belarus (NHAB). Fund 319. I. 2. F. 1890.
8. Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca cztaternastego wieku. Warszawa, 1895. 473 s.
9. Dolgorukiy P. V. *Rossiyskaya rodoslovnaya kniga. V 4 t. T. 1* [Russian genealogical book. In 4 vol. Vol. 1]. St. Petersburg, 1854. 342 p.
10. Narbut A. N. *Geneologiya Belorusii. Vypusk 2 (16–18 vv.)* [Genealogy of Belarus. Issue 2 (16–18 ct.)]. Moscow, Izd-vo "Anna" Publ. 1994. 168 p.
11. *Obshchiy gerbovnik dvorianskikh rodov Rossiyskoy imperii, nachatyy v 1797 godu. Chast' 13* [Common arms of the noble families of the All-Russian empire, begun in 1797. Part 13]. St. Petersburg, 1885. 562 p.
12. Boniecki A. Herbarz Polski. 16 t. T. 13. Warszawa, 1909. 400 s.
13. NHAB. Fund 319. I. 2. F. 689.

## Інфармацыя пра аўтара

**Дамарад Аляксей Анатольевіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і палітологіі. Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт (220006, г. Мінск, вул. Свярдлова, 13а, Рэспубліка Беларусь). E-mail: domorad@belstu.by

## Information about the author

**Damarad Aliaksei Anatolievich** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of History of Belarus and Political Science. Belarusian State Technological University (13a, Sverdlova str., 220006, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: domorad@belstu.by

*Паступіў 02.03.2018*